# Па найлепшых узорах

Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала конкурс да 85-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна і запрашае да ўдзелу школьнікаў 4—11 класаў. Прымаюцца плакаты з цытатамі творцы і эсэ.

Па ўмовах канкурсу ўдзельнікі чытаюць творы Рыгора Барадуліна і выбіраюць любую цытату з творчай спадчыны пісьменніка, якая спадабалася, а затым афармляюць плакат у адпаведнасці з варыянтамі на выбар: выкарыстоўваючы дызайнерскае рашэнне плаката, прапанаванае на партале Нацыянальнай бібліятэкі, альбо асабістым мастацкім афармленнем. Затым яны пішуць невялікае эсэ з тлумачэннем выбару цытаты, сканіруюць творчую работу і дасылаюць разам з эсэ на электронную пошту *konkurs.baradulin85@gmail.com* альбо выкладаюць у сацыяльнай сетцы *Facebook* з хэштэгамі *#konkurs_baradulin85 #cytata_baradulin*.




*Фота з сайта nlb.by.*

Мэты конкурсу — павышэнне цікавасці навучэнцаў да беларускай мовы і літаратуры, прыцягненне ўвагі да важнасці чытання, выхаванне падрастаючага пакалення на найлепшых узорах нацыянальнай літаратуры, садзейнічанне ўкараненню дадатковых форм навучання, а таксама пашырэнне магчымасцей для самарэалізацыі і развіццё творчага патэнцыялу вучняў.

Тры пераможцы, якія зоймуць I—III месцы, будуць адзначаны памятнымі дыпломамі, бясплатнай экскурсіяй па бібліятэцы (з наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку) для ўсяго класа альбо сяброў удзельніка конкурсу, фотасесіяй падчас экскурсіі, размяшчэннем конкурснай работы і інфармацыі пра аўтара на партале бібліятэкі і ў навукова-метадычным часопісе «Выхаванне і дадатковая адукацыя», кнігамі, падарункавымі пакетамі з прадукцыяй выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». Акрамя галоўных пераможцаў, будуць адзначаны яшчэ дзесяць найлепшых работ.

Конкурсныя работы прымаюцца да 31 ліпеня. Вынікі будуць абвешчаны да 28 жніўня.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**